# ГІСТОРЫЯ

УДК 902.2:378(476.7)

***А.А. Башкоў***
*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: bashkow@mail.ru

## ДАСЛЕДАВАННІ АРХЕАЛАГІЧНАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ БрДУ ІМЯ А.С. ПУШКІНА Ў КАМЯНЕЦКІМ РАЁНЕ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

*У артыкуле прадстаўлены асноўныя вынікі палявых даследаванняў археалагічнай экспедыцыі БрДУ імя А.С. Пушкіна на тэрыторыі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Акцэнт зроблены на пачатак новага этапа археалагічнага вывучэння Камянеччыны, у прыватнасці летапіснага Камянца і старажытнага мястэчка Воўчын. Вынікі экспедыцыйнай працы прадстаўлены ў храналагічным парадку, што дазваляе сфарміраваць уяўленні пра этапы назапашвання і сістэматызацыі здабытага археалагічнага матэрыялу па кожным аб'екце. Выказаны заўвагі і меркаванні адносна тапаграфіі, архітэктуры, пахавальных комплексаў Камянца і Воўчына, а таксама матэрыяльнай культуры жыхароў гэтых населеных пунктаў у перыяд з ранняга сярэднявечча да Новага часу.*

**Уводзіны**

Ад часу абвяшчэння Рэспублікай Беларусь незалежнасці археалагічныя даследаванні на Брэстчыне, у прыватнасці ў Камянецкім раёне, з'яўляюцца неад'емнай часткай гісторыка-археалагічнага вывучэння нашай Бацькаўшчыны навуковымі, адукацыйнымі і рэстаўрацыйна-праектнымі ўстановамі. Спецыялісты-археолагі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з 90-х гг. XX ст. праводзяць на берасцейскай зямлі штогадовыя даследаванні. На тэрыторыі Камянецкага раёна помнікі эпохі каменнага веку і бронзы даследуюць Вадзім Леанідавіч Лакіза і Алег Юр'евіч Ткачоў; помнікі жалезнага веку вывучае Вадзім Георгіевіч Белявец. Помнікі эпохі Сярэднявечча ў свой час цікавілі Алега Вільгельмавіча Іова. Значны аб'ём працы па вывучэнні археалагічных помнікаў Камянеччыны з канца XX ст. зроблены намаганнямі навукоўцаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.

З канца другога тысячагоддзя ўсе мерапрыемствы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і даследаванні археалагічных помнікаў, як неад'емная іх частка, грунтуюцца на шэрагу нарматыўна-прававых актаў, прынятых і ўдасканаленых на працягу апошніх гадоў. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, прыняты Палатай прадстаўнікоў 2 чэрвеня 1999 г. і ўхвалены Саветам Рэспублікі 24 чэрвеня 1999 г., утрымлівае шэраг артыкулаў (344–347), у якіх акрэслена адказнасць за руйнаванне, пашкоджанне і знявагу гісторыка-культурных помнікаў. Акрамя таго, яшчэ шэраг законаў і пастаноў рэгулююць дзейнасць, звязаную з аховай і рэстаўрацыяй гісторыка-культурных і архітэктурных помнікаў: Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 чэрвеня 2004 г. № 300-З «Аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» (прыняты Палатай прадстаўнікоў 8 чэрвеня 2004 г., ухвалены Саветам Рэспублікі 16 чэрвеня 2004 г.); Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. № 98-З «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» (прыняты Палатай прадстаўнікоў 12 снежня 2005 г., ухвалены Саветам Рэспублікі 21 снежня 2005 г.); пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 мая 2002 г. № 651 «Аб зацвярджэнні палажэння аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ»; пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 г. № 762 «Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны». Усе работы, якія праводзіліся археалагічнымі экспедыцыямі БрДУ імя А.С. Пушкіна, абапіраліся на дадзеныя нарматыўна-прававыя

акты. Сёння база пашырылася дзякуючы шэрагу новых прававых актаў: пастанова Рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь № 11-01-01/217 ад 20.08.2014 г.; Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2015 г. № 485 «Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў»; Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры ад 20 ліпеня 2016 г. № 413-З (прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2016 г., ухвалены Саветам Рэспублікі 30 чэрвеня 2016 г.). Але дзякуючы намаганням спецыялістаў і студэнтаў гістарычнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна яшчэ ў першае дзесяцігоддзе XXI ст. былі зроблены значныя археалагічныя адкрыцці.

У дадзенай працы прадстаўлены асноўныя вынікі дзейнасці археалагічнай экспедыцыі гістарычнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна ў перыяд 1998–2010 гг.; адзначаны яе ўклад у вывучэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны Берасцейшчыны; акрэслены перспектывы выкарыстання вынікаў працы археалагічных экспедыцый.

**Даследаванні Камянца**

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 8 кастрычніка 2002 г. № 1395 «Аб сістэме мер, якія забяспечваюць правядзенне рэстаўрацыйна-ўзнаўляльных прац на найбольш важных аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» указвае на першачарговасць аб'ектаў у кожнай вобласці Рэспублікі Беларусь, якія патрабуюць тэрміновай рэстаўрацыі і рэканструкцыі. У Камянецкім раёне гэта шэраг вядомых помнікаў: Камянецкая вежа XIII ст., палаца-паркавы комплекс XVII–XIX стагоддзяў у г. Высокае, сядзіба XIX ст. у в. Грамяча.

Згодна з дадзенай праграмай у Камянецкай вежы і ў г. Камянцы былі праведзены археалагічныя раскопкі. Даследаванні Камянца праводзіліся ў 1998–2003 гг. і ўключалі ў сябе вывучэнне культурных напластаванняў замчышча і старажытнага горада, а таксама гарадскога могільніка XIV ст.

На жаль, прыходзіцца канстатаваць адсутнасць да нядаўняга часу ўвагі даследчыкаў да ўнікальнасці горада Камянца, вядомага нам па летапісных крыніцах з 1276 г. Толькі знакамітая Белая вежа ў розныя часы прыцягвала да сябе ўвагу гісторыкаў, этнографаў, архітэктараў, мастакоў. Напалеон Орда ў сваіх малюнках захаваў магутныя абрысы вежы. Леў Сямёнавіч Паеўскі паспрабаваў паказаць гісторыю гэтага велічнага збудавання ў кантэксце этнаграфічна-краязнаўчага вывучэння рэгіёна. Мікалай Пятровіч Авенарыус звярнуўся да гісторыка-архітэктурных асаблівасцяў гэтага абарончага збудавання. Як састаўная частка сістэмы абарончых збудаванняў валынскіх і беларускіх зямель разглядалася вежа вядомым савецкім даследчыкам П.А. Рапапортам [16; 17] і беларускім знаўцам абарончай архітэктуры М.А. Ткачовым [19].

Першым з сучасных даследчыкаў, каго зацікавіла праблема археалагічнага вывучэння старажытнага Камянца, стаў старшы навуковы супрацоўнік аддзела сярэднявечнай археалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук Алег Вільгельмавіч Іоў. У межах разведак у Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці ў 1997 г. ім быў закладзены шурф каля вежы для высвятлення наяўнасці культурнага пласта. На жаль, намаганні былі дарэмнымі. Гэта паставіла шэраг пытанняў аб праўдзівасці рэканструкцыі вежы, прапанаванай Я. Куліком і М.А. Ткачовым і змешчанай у энцыклапедычным выданні [13].

Для далейшага даследавання старажытнага горада і яго ваколіц была сфарміравана Заходнепалеская археалагічная група на чале з супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі А.В. Іовам і супрацоўнікам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта А.А. Башковым. Даследчыкі паставілі перад сабой мэту на падставе вывучэння археалагічных крыніц рэканструяваць аблічча старога горада і прасачыць асаблівасці гістарычнага развіцця гэтага населенага пункта і яго ваколіц. Былі пастаўлены задачы даследавання:

1) лакалізаваць старажытны замак;

2) вызначыць магчымую гісторыка-тапаграфічную пераемнасць горада з паселішчамі больш ранняга часу;

3) прасачыць эвалюцыю плaніграфіі горада з канца XIII ст.;

4) знайсці і вывучыць культурныя пласты;

5) рэканструяваць выгляд першапачатковага паселішча і яго абарончых збудаванняў;

6) даследаваць матэрыяльную культуру г. Камянца (з канца XIII ст.);

7) вывучыць ваколіцы горада на наяўнасць археалагічных помнікаў і пры знаходжанні даследаваць іх.

Грунтоўны археалагічны маніторынг горада і ваколіц распачаўся ў 1998 г. У палявых працах прымалі ўдзел студэнты гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гэта быў першы вопыт працы ўласна ўніверсітэцкай археалагічнай экспедыцыі па вывучэнні знакавых археалагічных помнікаў. Археалагічныя раскопкі вяліся да 2004 г. [9; 12].

Першая праблема, з якой сутыкнуліся археолагі, – гэта шчыльная забудова і камунікацыі на прылеглай да вежы тэрыторыі, а таксама парушэнне культурных пластоў рэстаўрацыйнымі працамі пачатку XX ст. па праекце У. Суслава. У сувязі з гэтым была абрана тактыка малых раскопаў. Плошча раскопаў вагалася ад 4 да 32 м². Усяго было ўскрыта 174 м². Магутнасць культурных напластаванняў дасягала чатырох метраў.

У выніку археалагічнага вывучэння старажытнага Камянца ўдалося знайсці і вывучыць культурныя пласты канца XIII – XVIII стагоддзяў. Быў лакалізаваны старажытны замак авальнай формы прыкладна 40 × 40 м, які знаходзіўся на захад ад вежы (цяпер тэрыторыя гімназіі). Намі была зроблена спроба рэканструкцыі сістэмы абарончых збудаванняў, якая ўяўляла сабой дзве адасобленыя выспы, абнесеныя валам і акружаныя рвом. На заходняй выспе размяшчаўся першапачатковы замак, на ўсходняй – вежа [1]. Гэта былі дзве адасобленыя абарончыя адзінкі, якія, хутчэй за ўсё, звязваліся драўляным мастком. Яны маглі выступаць як адзінае цэлае, але пры неабходнасці маглі трымаць абарону ізалявана. Для прыкладу можна ўзгадаць падзеі канца XIV ст., калі замак быў спалены, а вежа так і не скарылася крыжакам.

Здабыты археалагічны матэрыял даваў падставы дапускаць існаванне ўязной брамы ў замак з поўдня. Жылыя будынкі былі размешчаны насупраць брамы з паўночнага боку замкавай пляцоўкі, гаспадарчыя пабудовы – з абодвух бакоў ад уязной брамы, а пасярэдзіне пляцоўкі быў незабудаваны двор.

Зробленую археолагамі рэканструкцыю абсалютна падцвердзіў план старажытнага Камянецкага замка, датаваны канцом XVIII ст. Ён быў знойдзены супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі А.А. Мяцельскім у 2008 г. у Аддзеле рукапісаў бібліятэкі РАН у Санкт-Пецярбургу (Збор рукапісных мап. Дадатковы вопіс. № 240, арк. 14). Важным з’яўляецца тое, што рэканструкцыя 2004 г. практычна дакладна супадае з пазначанымі на плане элементамі: памеры і форма абарончых збудаванняў, размяшчэнне ўязной брамы, жылых і гаспадарчых пабудоў. Адзіным дапушчэннем даследчыкаў з’яўляецца ўласна драўляная канструкцыя замка. На жаль, матэрыялы раскопак не выявілі захаваных рэштак драўляных канструкцый старажытнага Камянца, таму археолагі ў сваіх меркаваннях грунтаваліся на аналогіях, якія вядомыя з раскопак старажытных беларускіх гарадоў, у тым ліку Бярэсця. Такім чынам, была даказана недакладнасць рэканструкцыі Я. Куліка, змешчанай у спецыяльнай літаратуры, у тым ліку і энцыклапедычных выданнях.

У выніку даследаванняў было прасочана пашырэнне межаў горада ўздоўж вуліц Піўненка, Гогаля, Леніна. На вуліцы Піўненка, каля будынка былога Дома піянераў, быў лакалізаваны могільнік XVII–XVIII стагоддзяў і выяўлены падмуркі каплічкі гэтага

перыяду. На жаль, лакалізаваць месцазнаходжанне царквы Звеставання, пабудаванай Уладзімірам Васількавічам, не ўдалося.

Падчас вывучэння культурных напластаванняў былі зроблены цікавыя знаходкі: прылады працы, зброя, значная калекцыя манет XVI–XX стагоддзяў, рэчы паўсядзённага побыту і ўпрыгожванні. Унікальнай знаходкай з'яўляецца кафля XVI ст. з выявай маладога чалавека ў сярэднявечнай вопратцы, аналогіі якой вядомы ў нязначнай колькасці на тэрыторыі Беларусі. Матэрыялы перадмацерыковага пласта (керамічны матэрыял) далі сведчанні пра існаванне на месцы старажытнага замка паселішча X ст.

Археалагічныя разведкі, якія праводзіліся А.А. Башковым у 1998 г. у басейне р. Лясная, недалёка ад г. Камянца, далі нечаканыя вынікі. На правым беразе ракі за межамі горада на паўночны захад ад Камянецкай вежы, на ўзвышшы, якое жыхары называюць «манастыр», былі знойдзены рэшткі грунтовых пахаванняў. Цікаўнасць выклікала мясцовае паданне пра існаванне ў старажытнасці манастыра, які падчас маскоўскай навалы пайшоў пад ваду. Верагодней за ўсё, трэба атаясамляць гэтае паданне з падзеямі другой паловы XVII ст., калі войскі ваяводы Івана Хаванскага зруйнавалі мястэчка і спалілі Уваскрасенскі манастыр. Дадзеная інфармацыя паспрыяла пачатку земляных прац на вышэйазначаным месцы [8; 11].

Праца на дадзеным помніку таксама праводзілася сіламі студэнтаў гістарычнага факультэта БрДУ ў межах археалагічнай практыкі, прадугледжанай вучэбнымі планамі ўніверсітэта. Штогадовыя археалагічныя даследаванні мясцовасці далі наступныя вынікі. Усяго было закладзена 5 шурфоў агульнай плошчай 72 м$^2$: у 1998 г. – 4 м$^2$; у 1999 г. – 12 м$^2$; у 2000 г. – 8 м$^2$; у 2001 г. – 24 м$^2$; у 2002 г. – 24 м$^2$; у 2003 – 24 м$^2$; у 2004 – 8 м$^2$. Глыбіня культурнага пласта вагалася ад 22 да 70 см (без уліку ям).

На ўскрытай плошчы зафіксавана 5 цэлых пахаванняў (у чатырох былі знойдзены пашкоджаныя чэрапы), 11 пашкоджаных пахаванняў, якія захаваліся ў выглядзе згрупавання касцей і чэрапаў. Пяць пахаванняў ідэнтыфікаваны як дзіцячыя. Адно з дзіцячых пахаванняў пашкоджана, нягледзячы на заглыбленне ў мацярык. Акрамя таго, знойдзены дзве тленныя плямы ад дзіцячых пахаванняў. Па ўсёй плошчы раскопу на рознай глыбіні траплялiся адзінкавыя чалавечыя косці з пашкоджаных пахаванняў.

Пахаванні знаходзіліся на рознай глыбіні – ад 20 да 75 см. Толькі два дзіцячыя пахаванні заглыбляліся ў мацярык на 16 і 24 см. Арыентацыя касцякоў пераважна заходняя, у некаторых выпадках з невялікім адхіленнем на паўднёвы захад. Толькі адно пахаванне зарыентавана на паўночны захад. У сямі выпадках зафіксавана палажэнне рук: у адным правая рука на грудзях, левая ўздоўж, у астатніх правая і левая на жываце; правая на жываце, левая на поясе; правая страчана, левая на поясе; правая на грудзях, левая страчана; правая на грудзях, левая на жываце; правая на грудзях, левая на жываце.

Толькі ў двух пахаваннях знойдзены суправаджальны інвентар – адзінаццаць фрагментаў бронзавых дэкаратыўных дэталяў на пас, якія знаходзіліся ў раёне жывата на касцяку дарослага, і два касцяныя гузікі ў раёне грудзей на касцяку падлетка (верагодна дзяўчынкі). Цікаўнасць выклікаюць якраз фрагменты бронзавых дэталяў паса, знойдзеныя ў 2001 г. Сярод іх вылучаюцца дзве літыя спражкі і частка крука для зашпільвання. Накладкі таксама літыя, але двухсастаўныя. Дэкаратыўная частка, якая спалучалася з тыльнай пласцінай заклёпкамі, мацавалася, верагодна, на скураны пас. Аналаг дадзенай знаходкі вядомы з пластоў XIV ст. у старажытным Ноўгарадзе [18].

Другая цікавая знаходка – керамічны гаршчок, знойдзены ў 2001 г. сярод згрупавання камянёў на глыбіні 30 см. Гаршчок захаваўся амаль поўнасцю. Страчаны толькі невялічкі кавалак венчыка і бакавіны. Папярэдне яго можна аднесці да ўзораў керамікі перыяду XIV–XV стагоддзяў. Практычная адсутнасць пахавальнага інвентару, арыентацыя, палажэнне і ўзроўні залягання касцякоў сведчаць пра неадначасовасць пахаванняў і іх хрысціянскі абрад.

Дарэзаная і ўскрытая плошча раскопаў у 2003 і 2004 гг. дала нам істотныя ўдакладненні ў вызначэнні асаблівасцяў размяшчэння пахаванняў. Мы можам сёння сцвярджаць аб пэўнай сістэмнасці ў пахаваннях. Калі ўсходняя частка камбінаванага раскопу мела сур'ёзныя пашкоджанні па прычыне сельскагаспадарчай апрацоўкі зямлі, то заходняя яго частка (ускрыта ў 2002, 2003, 2004 гг.) дае карціну шэраговага размяшчэння пахаванняў прыкладна на адной адлегласці. Так, на сённяшні дзень можна рэканструяваць 4 шэрагі пахаванняў. Прычым зазначым, што заглыбленне ішло ў бок павелічэння з усходу на захад. І калі пахаванні на ўсходзе прасочаны ўжо на глыбіні 20 см (моцна пашкоджаныя распашкай), то на захадзе пахаванні зафіксаваны ўжо ў мацерыковых ямах на глыбіні да 70 см ад дзённай паверхні.

Упершыню ўдалося прасачыць два пахаванні ў трунах. Гэта пахаванні двух дарослых людзей, мужчыны і жанчыны, з лёгкім адхіленнем у арыентацыі на паўднёвы захад. Рукі ў абоіх знаходзіліся ў аднолькавым палажэнні: правая на грудзях, левая на жываце. Менавіта ў галавах гэтых пахаванняў на глыбіні ад 15 см зафіксаваны развалы двух ганчарных гаршкоў, пастаўленых уверх донцам. Усё гэта дало нам магчымасць прасачыць пэўную сістэмнасць у пахаваннях, больш поўную карціну самога пахавальнага абраду з выразнымі слядамі трызны.

Чаргаванне дзіцячых і падлеткавых пахаванняў і пахаванняў дарослых у кожным з могільнікаў сведчыць аб пэўнай сваяцкай прыналежнасці альбо нават сямейнасці пахаваных. Правядзенне антрапалагічнага аналізу костных рэштак, што з'яўляецца прыярытэтным накірункам у далейшым вывучэнні могільніка каля г. Камянец, дасць нам значна большую інфармацыю.

Такім чынам, даследаванні грунтовага могільніка ва ўрочышчы Манастыр каля Камянца даюць падставы сцвярджаць аб адкрыцці аднаго з першых гарадскіх могільнікаў першай паловы XIV ст. на правым беразе р. Лясная на паўночны захад ад старажытнага гарадзішча і вежы. Праведзеныя археалагічныя даследаванні дазволілі змяніць уяўленні пра тапаграфію і выгляд старажытнага Камянца, вывучыць яго матэрыяльную культуру і пахавальны абрад першых жыхароў, а таксама адкрыць новыя старонкі яго насычанай гісторыі.

Поўныя справаздачы аб выніках археалагічнага вывучэння Камянца і яго ваколіцы знаходзяцца ў архіве Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Увесь здабыты археалагічны матэрыял перададзены ў фонды Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея і стаў асновай для экспазіцыі, якая адкрылася ў 2004 г. у адрэстаўраванай Камянецкай вежы.

**Даследаванні Воўчына**

Увага да гісторыі старажытнага Воўчына заўсёды межавала з цікаўнасцю да лёсу апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Гэта прасочваецца ва ўсіх навуковых і навукова-папулярных выданнях пачынаючы з прац польскіх даследчыкаў 30-х гг. XX ст. [22; 23]. Усплеск цікаўнасці да Воўчына ў канцы 80–90-х гг. XX ст. звязаны з пошукам парэштак караля ў ходзе расчысткі завалаў занядбанага Троіцкага касцёла і перадачай знойдзеных артэфактаў у Польшчу для афіцыйнага перазахавання ў каралеўскім замку ў Варшаве [14; 21; 24]. Апошнія публікацыі, прысвечаныя гісторыі Воўчына і пошуку парэштак караля, а таксама рэстаўрацыі Троіцкага касцёла, з'явіліся ў Беларусі параўнальна нядаўна [20]. Такім чынам, сам час вывеў вывучэнне гісторыі старажытнага мястэчка на новы этап – археалагічны.

Згодна з рэспубліканскай праграмай па адраджэнні сяла на 2015–2010 гг., абласной праграмай па развіцці сельскай культуры, раённай праграмай па будаўніцтве аграгарадкоў, пастановай Брэсцкага аблвыканкама ад 9 лістапада 2004 г. № 21/1-29, было прынята рашэнне аб стварэнні краязнаўчага музея ў в. Воўчын Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. У сувязі з гэтым археалагічная экспедыцыя БрДУ імя А.С. Пушкіна

ў 2005–2007 і 2009 гг. правяла даследаванні на тэрыторыі старадаўняга мястэчка, палаца-паркавага комплекса Чартарыйскіх XVIII ст. і ваколіц [2–7; 10].

Перад экспедыцыяй былі пастаўлены задачы:

1) даследаваць мясцовасць на наяўнасць археалагічных помнікаў і культурных пластоў;

2) лакалізаваць месца першапачатковага паселішча;

3) прасачыць тапаграфію мястэчка;

4) вывучыць асаблівасці архітэктуры, планіроўкі і функцыянавання сядзібнага комплекса XVIII ст.;

5) вывучыць матэрыяльную культуру насельніцтва Воўчына ў розныя перыяды.

Пачатковым этапам нашых даследаванняў было вывучэнне плана палаца-паркавага комплекса ў Воўчыне, складзенага ў 1762 г. французскім архітэктарам П'ерам дэ Тэрыгаем. З дапамогай камп'ютарнай тэхнікі былі параўнаны план XVIII ст. і сучасны план в. Воўчын. Гэта дазволіла прывязаць шурфы з улікам тапаграфічных і ландшафтных зменаў.

Падчас прац у 2005 г. было закладзена 9 шурфоў агульнай плошчай 116 м². Удалося дакладна высветліць месцазнаходжанне старажытнага палаца Чартарыйскіх, пабудаванага ў XVIII ст. Дадзена характарыстыка рэшткаў канструкцый і высветлены стан іх захавання. Акрамя таго, былі выяўлены і даследаваны культурныя пласты перыяду XIV–XVIII стагоддзяў. Шурфы № 8–10, разбітыя на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі (т.зв. Стары Воўчын) на надпойменнай тэрасе на правым беразе р. Пульва, далі магчымасць лакалізаваць месца першапачатковага паселішча. Аналіз керамічнага матэрыялу паказаў, што сярод артэфактаў названых шурфоў ёсць некалькі фрагментаў ляпной керамікі VIII–X стагоддзяў Лукі-Райкавецкага культурнага арэала і фрагменты раннеганчарнай керамікі X ст. Асноўны керамічны матэрыял датуецца XIV–XVI стагоддзямі.

Такім чынам, мы пацвердзілі факт узнікнення старажытнага Воўчына мінімум на адно стагоддзе раней, чым ён згадваецца ў пісьмовых крыніцах (дакументы 1496 г. і 1516 г. са звесткамі аб Воўчыне) [20]. Акрамя таго, мы прасачылі заканамернасць тапаграфічнага развіцця гэтага населенага пункта. Паселішча ўзнікла на надпойменнай тэрасе правага берага р. Пульва ў XVI–XVIII стагоддзях і пашырылася на поўнач і паўночны захад уздоўж рэчкі.

Археалагічная калекцыя, сабраная падчас раскопак, дае падставы для аналізу матэрыяльнай культуры паселішча ў розныя гістарычныя перыяды. Багаты керамічны матэрыял, датаваны XVII–XIX стагоддзямі, дае ўяўленне аб рэгіянальнай своеасаблівасці ганчарнай вытворчасці гэтага перыяду. Дададмо яшчэ калекцыю манет XVII – пачатку XX ст., якая складае 16 адзінак, і 11 розных гузікаў, сярод якіх можна адзначыць чатыры пазалочаныя і адзін сярэбраны.

Пасля заканчэння работ па просьбе мясцовай адміністрацыі ўскрытыя падмуркі палаца Чартарыйскіх былі накрыты адмысловым навесам, што дазволіла прадухіліць уздзеянне ападкаў і іншых знешніх фактараў, якія маглі б пашкодзіць каменна-цаглянай канструкцыі. Зроблена гэта было таксама і ў сувязі з магчымымі далейшымі работамі па вывучэнні і рэканструкцыі старажытнасцяў Воўчына ў перспектыве.

За сезон 2006 г. было закладзена 4 шурфы агульнай плошчай 60 м². У выніку былі выяўлены і даследаваны культурныя пласты XIV–XVIII стагоддзяў. Шурф № 10, разбіты на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі (Стары Воўчын) на надпойменнай тэрасе правага берага р. Пульва, даў магчымасць пашырыць вывучаемую плошчу першапачатковага паселішча Лукі-Райкавецкага культурнага арэала VIII–X стагоддзямі і пласты старажытнага Воўчына XIV–XVI стагоддзяў.

Матэрыялы шурфа № 13 далі інфармацыю пра існаванне ў XVIII ст. вялікай пабудовы недалёка ад будынка былой ратушы. Яна была, верагодна, гандлёвага прызначэння, пра што сведчыць археалагічны матэрыял (манеты, таварныя пломбы). Яна зга-

рэла ў пачатку XIX ст. Далейшае вывучэнне дадзенага збудавання дазволіць зрабіць больш дэталёвыя і шырокія высновы пра гісторыю гэтага помніка.

Вынікі археалагічных пошукаў 2006 г. пацвердзілі вызначаную раней заканамернасць тапаграфічнага развіцця населенага пункта. Здабытая археалагічная калекцыя папоўніла ўжо сабраную базу артэфактаў для аналізу матэрыяльнай культуры паселішча ў розныя гістарычныя перыяды. Адзначым калекцыю індывідуальных знаходак: манеты XVII – пачатку XX ст., гузікі, сярод якіх можна адзначыць пазалочаны, тарарныя пломбы, шматлікія прадметы побыту.

Асаблівай увагі заслугоўвае бронзавая пячатка з выявай шляхецкага герба «Налэнч», знойдзеная ў шурфе № 12 (пласт 3, квадрат 2). Вышыня пячаткі 3 см. Працоўная частка мае авальную форму памерам 1,6 × 1,8 см. Рукаятка мае дэкаратыўную трохкутную форму з невялікім кальцом зверху. На пячатцы намаляваныя: у цэнтры поля завязаная на вузел хустка ў атачэнні двух страусіных пер'яў і каралеўскай каронай зверху; па баках кароны – літары «З» і «М» у люстравым адбітку. Датуецца знаходка, верагодна, часам не пазней за XVIII ст.

За перыяд работ у 2007 г. былі закладзены 2 шурфы агульнай плошчай 20 м² і адзін раскоп плошчай 84 м². У выніку былі выяўлены і даследаваны фрагменты падмуркаў будынка XVIII ст. – яшчэ аднаго з архітэктурнага комплекса сядзібы Чартарыйскіх – і культурныя пласты перыяду XIV–XVIII стагоддзяў.

Матэрыялы шурфаў далі інфармацыю аб вялікім будынку, які існаваў з XVIII ст., шырынёй 8,45 м і даўжынёй – 15,45 м. Будынак быў прамавугольнай формы, як мяркуецца, з шасцю памяшканнямі. Верагодна, ён быў разбураны ў пачатку XX ст. падчас Першай сусветнай вайны. Раскоп № 1, закладзены на захад ад будынка будучага музея, дазволіў прасачыць існаванне цагляна-каменнай агароджы, якая, верагодна, замыкала прастору надворка паміж будынкамі. Былі даследаваны добра захаваныя культурныя пласты XIV–XVII стагоддзяў, якія залягаюць на глыбіні да 120 см. Разам з мноствам масавага матэрыялу і індывідуальных знаходак былі вывучаны комплексы, датаваныя XVI–XVII стагоддзямі. Сярод іх рэшткі пабудовы, магчыма, гаспадарчага прызначэння з двума адкрытымі вогнішчамі і развал каменнай печы.

Археалагічная калекцыя, сабраная падчас раскопак, дазваляе правесці аналіз матэрыяльнай культуры паселішча ў перыяд XIV–XVII стагоддзяў. Керамічны матэрыял дае ўяўленне аб рэгіянальнай своеасаблівасці ганчарнай вытворчасці ў гэты перыяд. Значную калекцыю (больш за 200 адзінак) складаюць індывідуальныя знаходкі: манеты XVII–XX стагоддзяў (12 адзінак), прылады працы і прадметы побыту. Асобна трэба адзначыць калекцыю ювелірных вырабаў, а галоўнае, свінцовую матрыцу для вырабу дэкаратыўных накладак на адзенне ці конскую збрую. Іх наяўнасць сведчыць аб дзейнасці ў гэты перыяд ювеліра ў сядзібе, якая некалі размяшчалася на даследаванай тэрыторыі або недалёка ад яе.

Унікальнай знаходкай з'яўляецца бронзавая фібула. Адносіцца яна да прускага тыпу «вочкавых» фібул канца I – пачатку II ст. н.э. Выраб гэты характэрны для арэала пшэворскай культуры. Фібула ўяўляе сабой пласціну з выгнутай рыфлёнай «спінкай» і шчытком з шасцю «вочкамі». Ад элемента, які выконваў функцыю зашпількі, захаваўся толькі спіралепадобны фрагмент. На ўнутраным боку шчытка ёсць «язычок» для фіксацыі зашпількі. Даўжыня фібулы 7 см, шырыня шчытка – 1,7 см. З'яўленне дадзенага артэфакта ў раскопе трэба звязваць з верагодным знаходжаннем паблізу пшэворскіх комплексаў. Магчыма дапусціць іх знішчэнне або пашкоджанне ў ходзе гаспадарчай дзейнасці ўжо ў перыяд позняга сярэднявечча.

У 2009 г. працягваліся даследаванні каля Троіцкага касцёла. З усходняга боку да раскопу 2007 г. быў прырэзаны раскоп № 2 плошчай 60 м². Матэрыялы раскопу дазволілі пашырыць даследуемую плошчу сядзібы, сляды якой былі знойдзены раней.

Падчас прац на глыбіні 60 см былі знойдзены фрагменты збудавання, датуемага другой паловай XVII – першай паловай XVIII ст. Захаваліся фрагменты каменнага падмурка, падпадлогавага памяшкання з індывідуальнымі знаходкамі і рэшткамі печкі. Па-за межамі збудавання знойдзены аб’ект з канцэнтрацыяй перапаленых камянёў і фрагментамі керамічнага посуду. Сярод шматлікіх індывідуальных знаходак можна выдзеліць сярэбраныя манеты другой паловы XVIII – пачатку XIX ст., бронзавы шчытковы пярсцёнак з манаграмай і пярсцёнак з рэшткамі каштоўнага каменю.

Пры зачыстцы мацерыка былі знойдзены фрагменты ляпной арнаментаванай керамікі і рэтушаваная крэмневая пласціна, якія адносяцца да эпохі бронзы. Гэта сведчыць пра наяўнасць у гэтым мікрарэгіёне больш ранніх помнікаў.

У 2007 г. распачаліся актыўныя рэстаўрацыйныя працы ў Троіцкім касцёле. Працы праводзіліся прыватнай рэстаўрацыйнай фірмай з Польшчы пад кіраўніцтвам Віктара Вілька. Усе рэстаўрацыйныя мерапрыемствы праводзіліся з непасрэдным удзелам і пры падтрымцы вядомага дзеяча каталіцкай царквы кардынала Казіміра Свёнтака.

Пачатковы этап рэстаўрацыі прадугледжваў узмацненне і гідраізаляцыю падмуркаў касцёла. Падчас гэтых прац былі праведзены археалагічныя даследаванні па знешнім перыметры будынка. У выніку ўздоўж паўночна-ўсходняй і паўночна-заходняй сцен касцёла былі знойдзены пашкоджаныя пахаванні. Вялікая колькасць чалавечых костак была знойдзена ў перакопе пасярод паўночна-заходняй сценкі касцёла. Характар перакопу і нагрувашчванне костак сведчаць пра мэтанакіраванае іх перазахаванне ў адносна нядаўні час, магчыма ў канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст., калі распачаліся сціплыя спробы археалагічных і рэстаўрацыйных прац. Акрамя таго, каля паўночна-заходняй сцяны на глыбіні каля аднаго метра былі адкрыты чатыры «чытаемыя» пахаванні і два пашкоджаныя. Пахаванні арыентаваны з адхіленнем на паўночны захад у выцягнутым стане, рукі на жываце. Знаходжанне паблізу невялікіх жалезных кованых цвікоў дазваляе выказаць меркаванне аб выкарыстанні трун, аднак сляды драўляных дошак прасочаны толькі ў адным пахаванні. Усе чатыры пахаванні «рассечаны» падмуркам касцёла. Ніжнія пашкоджаныя канечнасці ўпіраюцца ў касцельны падмурак, а верхнія часткі двух заходніх пахаванняў выходзяць за межы закладзенай гідраізаляцыйнай траншэі. Усё гэта дае падставы сцвярджаць, што час пахаванняў большы, чым будаўніцтва касцёла ў 30-я гг. XVIII ст., калі і былі пашкоджаны вышэйапісаныя касцякі. У прылеглых да касцёла з паўночнага і ўсходняга бакоў пластах, якія перакрываюць пахаванні, знойдзены манеты сярэдзіны XVII ст. і керамічны матэрыял гэтага перыяду, што дае падставы датаваць знойдзеныя каля сцен касцёла пахаванні не пазней за сярэдзіну XVII ст. Таму можна выказаць меркаванне пра існаванне на ўзвышшы, дзе сёння месціцца Троіцкі касцёл, вялікага пахавальнага комплекса, а магчыма, і храмавага збудавання на пачатковым этапе развіцця мястэчка, г.зн. у XIV–XVII стагоддзях.

Усе людскія парэшткі былі перададзены для антрапалагічнай экспертызы кандыдату біялагічных навук, дацэнту кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Вользе Антонаўне Емяльянчык. Яна прыйшла да высновы, што шкілетны матэрыял з пахаванняў вакол касцёла прадстаўлены парэшткамі не менш чым шасці дарослых (двух мужчын, дзвюх жанчын, пол яшчэ двух вызначыць не ўдалося з-за фрагментарнасці коснага матэрыялу). Косткі з перакопу каля паўночна-заходняй сценкі належалі не менш чым чатыром дарослым і чацвярым дзецям ва ўзросце каля паўтара, 2–3, 6 і 12–15 гадоў.

Такім чынам, Воўчын стаў першым мястэчкам у заходняй Беларусі, дзе на працягу некалькіх гадоў вяліся шырокамаштабныя археалагічныя даследаванні. У цэлым археалагічнае вывучэнне Воўчына дало багаты матэрыял па гісторыі ўзнікнення і развіцця старажытнага заходнебеларускага мястэчка. Былі акрэслены заканамернасці тапаграфічнага развіцця населенага пункта. Паўстаўшы на надпойменнай тэрасе р. Пульва ў XVI–XVIII стагоддзях, паселішча пашырылася на поўнач і паўночны захад уздоўж ра-

кі, дзе ўзнік адміністрацыйны і гандлёвы цэнтр (рыначная плошча, гандлёвыя рады, ратуша). Разам з тым ужо з XIV ст. на тэрыторыі, якая знаходзіцца паміж касцёлам і будынкам будучага музея (колішняя плебанія), знаходзіліся сядзібы і канцэнтравалася гаспадарчая дзейнасць. Побач знаходзіўся пахавальны комплекс і, магчыма, храмавая пабудова. Пазней, у XVIII ст., тут і на поўнач ад Троіцкага касцёла быў пабудаваны цудоўны палаца-паркавы комплекс, састаўной часткай якога і стаў сам касцёл.

Усе вышэйпрадстаўленыя факты дазваляюць таксама як мінімум на стагоддзе «адсунуць» час узнікнення мястэчка Воўчын і аднесці яго да XIV ст. Апроч таго, адзначым, што падчас раскопак быў сабраны вялікі археалагічны матэрыял, які дазваляе нам вывучыць і рэканструяваць розначасовую матэрыяльную культуру жыхароў гэтага населенага пункта. Знойдзены ранні матэрыял эпохі бронзы і жалеза (кераміка, крэмневыя артэфакты і бронзавая фібула) сведчыць пра мнагаслойнасць дадзенага помніка і робіць яго перспектыўным для вывучэння больш старажытных этапаў нашай гісторыі.

**Заключэнне**

Працы на тэрыторыі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці археалагічнай экспедыцыі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна сталі пачатковым, але вельмі значным этапам у станаўленні прафесіяналізму навукоўцаў і набыцці вопыту палявых даследаванняў студэнтамі гістарычнага факультэта БрДУ. За 10 гадоў археалагічных прац на Камянеччыне ў экспедыцыях узялі ўдзел каля 150 студэнтаў-гісторыкаў. Быў зроблены шэраг значных адкрыццяў, звязаных з гісторыяй станаўлення і этапамі развіцця старажытных населеных пунктаў – Камянца і Воўчына. Маштабы вывучэння гэтых помнікаў можна суаднесці з даследаваннямі такіх старажытных беларускіх гарадоў, як Слуцк, Копыль, Клецк і інш. Наогул, комплекснае даследаванне Воўчына паклала пачатак такому накірунку ў археалогіі, як вывучэнне старажытнабеларускіх мястэчак. Вынікі даследаванняў не толькі атрымалі лагічны працяг у публікацыях, але і сталі асноўнай базай для стварэння археалагічнай музейнай экспазіцыі ў Камянецкай вежы, што, спадзяёмся, стане асновай для будучага краязнаўчага музея ў Воўчыне.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2009–2011. – Т. 1. – 2009. – С. 412–413.

2. Башков, А. А. Отчет за 2005 год об археологических исследованиях в д. Волчин Каменецкого района Брестской области / А. А. Башков // Цэнтральны навуковы архіў (ЦНА) НАН Беларусі. – Фонд архіву навуковай дакументацыі (ФАНД). Воп. 1. Арх. № 2319. – 23 с.

3. Башков, А. А. Отчет за 2006 год об археологических исследованиях в д. Волчин Каменецкого района Брестской области / А. А. Башков // ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 2336. – 20 с.

4. Башков, А. А. Отчет за 2007 год об археологических исследованиях в д. Волчин Каменецкого района Брестской области / А. А. Башков // ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 2529. – 36 с.

5. Башков, А. А. Отчет за 2009 год об археологических исследованиях в д. Волчин Каменецкого района Брестской области / А. А. Башков // ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 2707. – 24 с.

6. Башков, А. А. Археологические исследования Волчина / А. А. Башков // Гіст.-археал. зб. – Мінск, 2007. – Вып. 23. – С. 250–252.

7. Башков, А. А. Археологические исследования древнего Волчина в 2005–2006 гг. / А. А. Башков // Матеріали і дослідження з археології Прикарпаття і Волині. – Львів : Ін-т українознавства ім. І. Крип'якевича НАН України, 2008. – Вип. 12. – С. 316–323.

8. Башкоў, А. А Даследаванне грунтовага могільніка XIV ст. каля г. Камянца / А. А. Башкоў // Гіст.-археал. зб. – Мінск, 2005. – Вып. 20. – С. 250–251.

9. Башкоў, А. А. Археалагічныя даследаванні Камянца і ваколіц у 1997–2004 гг. / А. А. Башкоў, А. В. Іоў // Камянецкія чытанні : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Камянец, 4 верас. 2005 г. – Мінск : Права і эканоміка, 2006. – С. 14–19.

10. Башкоў, А. А. Даследаванні старажытнага Воўчына / А. А. Башкоў // Гіст.-археал. зб. – 2006. – Вып. 21. – С. 221–222.

11. Башкоў, А. А. Даследаванні грунтовага могільніка ў ваколіцах Камянца ў 1998–2002 гг. / А. А. Башкоў // Гіст.-археал. зб. – 2003. – Вып. 18. – С. 278–279.

12. Башкоў, А. А. Да пытання аб тапаграфіі і рэканструкцыі старажытнага Камянца / А. А. Башкоў, А. В. Іоў // Археологія і давня історія України. – 2017. – Вип. 1 (22) : Археологія : дослідження, експерименти, реконструкції. – С. 357–361.

13. Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1993. – 702 с.

14. Мілінкевіч, А. Воўчынская гісторыя / А. Мілінкевіч. – Гродна, 2004. – 77 с.

15. Пашкоў, Г. П. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / Г. П. Пашкоў. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2007. – Т. 4, кн. 2 : Брэсцкая вобласць. – С. 26–28.

16. Раппопорт, П. А. Военное зодчество западнорусских земель X–XIV вв. / П. А. Раппопорт. – Л. : Наука, 1967. – 242 с.

17. Раппопорт, П. А. Волынские башни / П. А. Раппопорт // Материалы Ин-та археологии. – М. : АН СССР, 1952. – Вып. 31. – С. 202–223.

18. Седова, М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода X–XV вв. / М. В. Седова. – М. : Наука, 1981. – 196 с.

19. Ткачоў, М. А. Замкі Беларусі XIII–XVII стагоддзяў / М. А. Ткачоў. – Мінск : Полымя, 1977. – 82 с.

20. Федорук, А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. – Минск : Беларус. Энцыкл., 2004. – С. 222–235.

21. Galwikowska-Świechowska, E. Wołczyn Stanisława Augusta / E. Galwikowska-Świechowska. – Warszawa, 1993. – 53 s.

22. Marczak, M. Przewodnik po Polesiu / M. Marczak. – Brześć nad Bugiem, 1935. – S. 53–67.

23. Wawryńczyk, A. Rozwój wielkiej własności na Podlasiu w XV i XVI wieku / A. Wawryńczyk. – Wrocław, 1951. – S. 86–87.

24. Zgorzelska, A. Dzieje królewskiego Wołczyna / A. Zgorzelska. – Warszawa, 1995. – 39 s.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 12.12.2017

***Bashkou A.A.*** **Research by Archaeological Expedition Brest State University in Kamenets District, Brest Region**

*The article presents the main results of field studies of archaeological expedition of Brest State University on the territory of Kamenets district, Brest region. Several comments and views on the topography, architecture, burial complexes of Kamenets and Volchin, are made and the material culture of the population of these settlements in the period from the early Middle Ages to modern times is considered.*